Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

***А.Ф. Вялікі***

# БЕЛАРУСЬ У САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ АДНОСІНАХ. 1944–1959 гг.

*Манаграфія*

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 947.6:943.8«1944/1959»
ББК 63.3(4Беи)+(4Пол)
В994

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар *Ул.Е. Снапкоўскі*

Навуковы рэдактар
кандыдат гістарычных навук *В.Дз. Селяменеў*

**Вялікі, А.Ф.**

В994 Беларусь у савецка-польскіх міждзяржаўных адносінах. 1944–1959 гг.: манаграфія / А.Ф. Вялікі; навук. рэд. канд. гіст. навук В.Дз. Селяменеў. – Мінск: БДПУ, 2010. – 248 с.

ISBN 978-985-501-850-7.

У манаграфіі паказаны роля і месца Беларусі ў савецка-польскіх міждзяржаўных адносінах у адзін з найбольш складаных перыядаў – другой палове 40-х – канцы 50-х гг. Даследуюцца праблемы вызначэння і дэмаркацыі беларуска-польскага ўчастку савецка-польскай дзяржаўнай граніцы, масавых перамяшчэнняў насельніцтва паміж БССР і Польшчай у сярэдзіне 40-х – канцы 50-х гг., беларуска-польскія міждзяржаўныя ўзаемаадносіны, станаўленне і развіццё прыгранічнага супрацоўніцтва.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ, а таксама тым, хто цікавіцца гісторыяй беларуска-польскіх узаемаадносін у другой палове XX ст.

**УДК 947.6:943.8«1944/1959»**
**ББК 63.3(4Беи)+(4Пол)**

**ISBN 978-985-501-850-7**

© Вялікі, А.Ф., 2010
© БДПУ, 2010

# УВОДЗІНЫ

Распад Савецкага Саюза і ўзнікненне на постсавецкай прасторы незалежных дзяржаў напрыканцы XX ст. канчаткова вызначылі і замацавалі месца Беларусі як незалежнай і суверэннай дзяржавы ў міжнароднай супольнасці. Рэспубліка Беларусь, вызначая знешнепалітычную дактрыну і перспектывы доўгатэрміновых і канструктыўных узаемаадносін з бліжэйшымі суседзямі, павінна зыходзіць у іх правядзенні са сваіх уласных нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў і прыярытэтаў. Узаемаадносіны з суседзямі будуюцца не на пустым месцы. Агульнае мінулае і агульная гісторыя прадугледжваюць не толькі захаванне пазітыўнага вопыту ўзаемаадносін з суседзямі, але і неабходнасць вывучэння, асэнсавання і пераадолення маючых узаемных негатыўных стэрэатыпаў. Новая сістэма ўзаемаадносін з суседзямі патрабуе ад айчынных гісторыкаў даследаванняў, якія б выяўлялі ролю і месца Беларусі ў міждзяржаўных узаемаадносінах паміж СССР і Польшчай, як краінамі, якія аказалі вызначальны ўплыў на фарміраванне яе тэрытарыяльнай цэласнасці.

Другая сусветная і Вялікая Айчынная войны з'явіліся адным з найбольш складаных перыядаў супольнага лёсу беларускага, рускага і польскага народаў. Для Беларусі адным з важнейшых геапалітычных вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў стала ўз'яднанне этнічных беларускіх зямель у адзінай дзяржаве і набыццё міжнароднай правасуб'ектнасці. Рашэнні міжнародных канферэнцый перыяду Другой сусветнай вайны (Тэгеран, Ялта, Патсдам), якія вызначылі савецка-польскую дзяржаўную граніцу, засведчылі легітымнасць уваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР, што садзейнічала тэрытарыяльнай і этнічнай кансалідацыі беларускай нацыі. Адзначым, што адно з важнейшых для беларускага этнасу пытанняў у XX ст. – уз'яднанне беларускіх этнічных зямель – было вырашана кіраўніцтвам Савецкага Саюза. Адстойваючы свае ўласныя нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў Савецкі Саюз, адным з заснавальнікаў якога з'яўлялася БССР, адстойваў нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы беларускага народа.

Уз'яднанне беларускіх зямель, якое адбылося ў верасні 1939 г., неабходна разглядаць не як аднамаментны акт, а як складаны доўгатэрміновы працэс, які завяршыўся пасля Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ён суправаджаўся значнымі тэрытарыяльнымі і людскімі стратамі. Вызначэнне, а потым дэлімітацыя і дэмаркацыя савецка-польскай дзяржаўнай граніцы і яе беларуска-польскага ўчастку, якія адбываліся ў 1944–1949 гг., прывялі да перадачы часткі тэрыторыі Беларусі суседняй дзяржаве – Польшчы. Вызначэнне дзяржаўнай савецка-польскай граніцы непазбежна выклікала правядзенне абмену насельніцтвам паміж БССР і Польскай Рэспублікай. Вынікам абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай у 1944–1946 гг. і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ